устойчивого развития : по материалам круглых столов / редкол. : С.А. Балашенко (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2014. – С. 8-11.

12. Экологическое право : учеб. пособие / С.А. Балашенко [и др.] ; под ред. Т.И. Макаровой, В.Е. Лизгаро. – Минск : Изд. центр БГУ, 2008. – 495 с.

13. Экологическое право : учебник / С.А. Балашенко [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2013. – 501 с.

14. Экологическое право : учебник / С.А. Балашенко, Т.И. Макарова, В.Е. Лизгаро. – Минск :Вышэйшая школа, 2016. – 383 с.

15. Макарова, Т.И. Доктрина международного права окружающей среды: формирование, основы, содержание / Т.И.Макарова // Евразийский юридический журнал. – 2013. – №10. – С.51-54.

16. Макарова, Т.И. Доктрина экологического права: формирование, содержание, отражение в законодательстве Республики Беларусь / Т.И. Макарова // Право в современном белорусском обществе : сб. науч. тр. / Нац. центр за-конодательства и правовых исследований Респ. Беларусь ;редкол. : В.И. Семенков (гл. ред.) [и др.]. Минск :Белпринт, 2014. – Вып. 9. – С.62–65.

17. Карпович, Н.А. Экологическая функция государства : в 2-х ч. Ч. 1 / Н.А. Карпович. – Минск : РИВШ, 2011. – 294 с.

18. Карпович, Н.А. Экологическая функция государства : в 2-х ч. Ч. 2 / Н.А. Карпович. – Минск : РИВШ, 2011. – 386 с.

19. Балашенко, С.А. Международно-правовая охрана окружающей среды и права человека / С.А.Балашенко, Т.И. Макарова. – Минск : World Wide Printing, 1999. – 254 с.

20. Балашенко, С.А. Государственное управление в области охраны окружающей среды / С.А.Балашенко. – Минск : БГУ, 2000. - 341 с.

21. Макарова, Т.И. Эколого-правовой статус граждан Республики Беларусь / Т.И.Макарова. – Минск : БГУ, 2004. – 231 с.

22. Правовые основы устойчивого развития на местном уровне / Т.И.Макарова [и др.] ; под общ. ред. Т.И.Макаровой. – Минск : ЕС/ПРООН-ООН, 2010. – 60 с.

23. Научно-практический комментарий к Закону Республики Беларусь от 26 ноября 1992 года «Об охране окружающей среды» в ред. закона от 17 июля 2002 года / Е.В.Лаевская, В.Е.Лизгаро, Т.И.Макарова ; науч. ред. Е.В.Лаевская, Т.И.Макарова. – Минск : Тонпик, 2005. – 272 с.

24. Руководство о порядке организации и проведения проверок соблюдения законодательства об охране окружающей среды и рациональном использовании природных ресурсов / С.А.Балашенко, [и др.] ; под ред. Е.В.Лаевской, Т.И.Макаровой. – Минск : Юнипак, 2003. – 280 с.

25. Правовые механизмы охраны окружающей среды и обеспечения экологической безопасности / Т.И. Макарова [и др.] ; под науч. ред. Т.И. Макаровой. – Минск : БГУ, 2016. – 191 с.

26. Влияние межгосударственных интеграционных процессов на развитие аграрного, экологического, природоресурсного и энергетического права : тез. докл. междунар. науч.-практ. конф., Минск, 26–27 апр. 2018 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Т. И. Макарова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2018. – 307 с.

**Максімчык Андрэй Мікалаевіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## АРМЯНЕ Ў ВЫШЭЙНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ БЕЛАРУСІ І ІХ УКЛАД У ПАДРЫХТОЎКУ НАВУКОВЫХ І ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ

Пазначанная праблема з’яўляецца аб’ектам разгляду у рамках выкладання аўтарам дысцыпліны спецыяльнай падрыхтоўкі для студэнтаў магістратуры “Этнічныя групы Беларусі: гісторыя, культура, сацыяльна-прававое становішча”. Сярод існуючых этнічных груп

значнае месца адводзіцца прадстаўнікам Закаўказскіх рэспублік, колькасць якіх па матэрыялах апошніх перапісаў насельніцтва (1999, 2009) пераўзыходзіць некалькі тысяч чалавек (армяне, грузіны, азербайджанцы). На сённяшні дзень армяне з'яўляюцца найбольш вялікай этнічнай групай народаў Каўказа, якая пражывае на тэрыторыі Беларусі. Больш за тое, гісторыя і культура армянаў на беларускіх землях вымяраецца некалькімі стагоддзямі і сыходзіць сваімі каранямі ў эпоху Сярэднявечча. З гэтай прычыны цікава прасачыць асноўныя накірункі дзейнасці прадстаўнікоў армянскага народа ў сістэме адукацыі і іх унёсак у справу падрыхтоўкі навуковых і педагагічных кадраў краіны.

Як не дзіўна, але прадстаўнікі армянскага народа прынялі актыўны ўдзел у пытаннях арганізацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Так, менавіта за подпісам **Аляксандра Фёдаравіча Мяснікова** (1886–1925) 25 лютага 1919 г. выйшаў Дэкрэт ЦВК рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў ССРБ, які пастанавіў "Адкрыць у гор. Мінску Дзяржаўны Універсітэт ..." [11]. Затым, на праведзенай 22 сакавіка 1919 г. ў Маскве нарадзе па арганізацыі дзяржаўнага ўніверсітэта ў Беларусі з кіруючымі работнікамі Наркамасветы РСФСР старшыня ЦВК ССРБ А. Ф. Мяснікаў у сваім выступе адзначыў: "Дзяржаўны універсітэт у Мінску ўжо з'яўляецца фактам. У Мінску працуе камісія з 7 асоб пры губернскім аддзеле народнай адукацыі. Універсітэт неабходны Беларусі па цэлым шэрагу меркаванняў: эканамічнага, тэхнічнага і культурна-бытавога характару мясцовага жыцця. Універсітэт павінен быць у Менску, бо гэта другі буйны культурны горад у Літоўска-Беларускай Рэспубліцы. У іншых гарадах Беларусі маюцца: у Віцебску – Пралетарскі універсітэт і Народная кансерваторыя, у Смаленску Універсітэт. У Вільні адкрываецца ўніверсітэт нацыянальнага тыпу. Камісія ў Мінску прызнала неабходным арганізаваць Універсітэт дзяржаўны, які складаецца з 4 факультэтаў пры двух асноўных: натуральна-матэматычным і грамадскіх навук. ЦВК Беларускай Рэспублікі ў пасяджэнні ад 24 лютага асігнавала 1 000.000 руб. са сродкаў Дзяржаўнага казначэйства. Адкрыццё ўніверсітэта прызначаецца прымеркаваць да Першамайскага свята. Памяшканне для ўніверсітэта ў Мінску знойдзецца. Цэнтр павінен прыйсці на дапамогу сіламі і сродкамі" [16, арк. 3]. Трэба зазначыць, што акрамя А. Ф. Мяснікова на гэтым пасяджэнні прысутнічала яшчэ двое армянаў, якія таксама адыгралі сваю ролю ў арганізацыі ўніверсітэта – загадчык аддзела вышэйшых навучальных устаноў Наркамасветы РСФСР **Вартан Тыгранавіч Тэр-Аганэзаў** (1890–1962) і загадчык аддзела асветы нацыянальных меншасцяў Наркамасветы РСФСР **Павел (Пагос) Мікітавіч (Мкртычавіч) Макінцыян (Макінцян)** (1888–1938). Менавіта В. Т. Тэр-Аганэзаву было даручана ўзначаліць камісію садзейнічання адкрыцця БДУ. Працу камісіі Вартан Тыгранавіч курыраваў на працягу 1919–1920 гг. Вынікам сумесных дзеянняў, у якой бачную ролю з абодвух бакоў адыгралі прадстаўнікі армянскага народа, стала адкрыццё ў 1921 г. універсітэта.

Акрамя арганізацыйных момантаў, з архіўных дакументаў вынікае, што з пачатку дзейнасці БДУ прадстаўнікі армянскага народа рабілі захады аб прызначэнні іх ў прафесарска-выкладчыцкі склад універсітэта.

Так, у 1921 г. на Факультэт грамадзянскіх навук спрабаваў уладкавацца прафесар Смаленскага ўніверсітэта мовазнаўца **Іосіф Карпавіч (Карапетавіч) Кукісьян** (1895–1964) [18, арк. 29; 19, арк. 13 адв.]. У 1922 г. прафесар Данскога ўніверсітэта спецыяліст у галіне гісторыі і тэорыі дзяржава і права **Сцяпан Фёдаравіч Кечэк'ян** (1890–1967) напісаў заяву ў Праўленне БДУ з мэтай заняць пасаду загадчыка кафедры агульнай тэорыі права і чытаць лекцыі па сацыялогіі і гісторыі палітычных вучэнняў [23, арк. 19]. Згодна з пратаколам № 18 паседжання Праўлення БДУ ад 2 мая 1923 г. па дакладзе дэкана педагагічнага факультэта М. М. Нікольскага планавалася запрасіць у якасці кандыдата для замяшчэння пасады па курсе параўнальнага мовазнаўства прафесара **Лявона Зармайравіча Мсерыянца** (1867–1933) [20, арк. 42 адв.]. Але па розных прычынах яны так і не сталі выкладчыкамі ўніверсітэта. У якасці выключэння можна прыгадаць толькі дацэнта педагагічнага факультэта БДУ **Арама Сяргеевіча Аруцюнянца** (1897–1936), які ў пачатку 1930-х гг. выкладаў філасофію [21, арк. 145]. Іншых звестак пра армянаў у складзе вышэйшых навучальных устаноў БССР у міжваенны час пакуль не выяўлена.

Значна больш інфармацыі пра выкладчыцкую і навуковую працу армянаў у ВНУ можна знайсці ў пасляваенны час, калі ў цэлым па БССР адбываецца прыкметны рост колькасці гэтай этнічнай групы. Згодна з перапісам насельніцтва 1959 г. у рэспубліцы было ўлічана 1751 чалавек (1228 мужчын і 523 жанчыны) [13, с. 124]. Прырост колькасці армянаў, у першую чаргу, можна патлумачыць разгарнуўшыміся працэсамі аднаўлення прамысловасці і сельскай гаспадаркі, набходнасцю запрашэння высокакваліфікаваных спецыялістаў у розных галінах. Так, яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай вайны вядомы лінгвіст **Сцяпан Рыгоравіч Бархудараў** (1894–1983), знаходзячыся ў эвакуацыі, пазнаёміўся з беларускімі калегамі і аказаў ім дапамогу ў падрыхтоўцы беларускай граматыкі. За гэта ён быў узнагароджаны знакам "Выдатнік Наркамасветы". Устаноўленыя сувязі С. Р. Бархударава з беларускімі філолагамі паспрыялі таму, што ў красавіку 1946 г. дырэктар Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута ім. М. Горкага (МДПІ) М. В. Макарэвіч звярнуўся да яго з прапановай заняць пасаду прафесара кафедры рускай мовы ў інстытуце. У лісце да мовазнаўцы ён таксама прасіў «узяць на сябе кіраўніцтва двума аспірантамі, кансультацыю 5–6-ці чалавек выкладчыкаў інстытута, якія рыхтуюцца да здачы кандыдацкага мінімуму і якія працуюць над дысертацыямі, арганізацыю навукова-даследчай работы кафедраў рускай і беларускай мовы. У будучым навучальным годзе пажадана было б, каб Вы таксама прачыталі спецкурс па мове для студэнтаў IV курса літфаку» [1, арк. 3]. Даўшы згоду, С. Р. Бархудараў з 1 мая 1946 г. была залічаны на стаўку прафесара ў МДПІ ім. М. Горкага. Паводле архіўных дакументаў, з 1 верасня 1947 г. ён працаваў на пасадзе прафесара кафедры рускай мовы (0,5 стаўкі), а з наступнага навучальнага года быў пераведзены на пагадзінную аплату. Нягледзячы на кароткачасовы беларускі перыяд у яго біяграфіі, Сцяпан Рыгоравіч паспеў шмат зрабіць. Ён быў навуковым кіраўніком М. Г. Булахава – у будучым вядомага беларускага лінгвіста, доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР.

У яго службовай характарыстыцы падкрэслівалася, што “кожны прыезд С. Р. Бархударава ў Мінск прыносіць выключнае ажыўленне ў лінгвістычных колах г. Мінска. На яго даклады сцякаюцца ўсе, хто цікавіцца пытаннямі сучаснай лінгвістыкі. Акрамя таго, С. Р. Бархудараў выступае з кіруючымі дакладамі па лінгвістыцы для работнікаў Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР. Вучоны-бальшавік, чалавек вялікай эрудыцыі, знаходзіць таксама час выступаць з вельмі важнымі метадычнымі і навуковымі дакладамі па мове для настаўніцтва г. Мінска” [1, арк. 8]. На пасяджэнні Вучонага савета інстытута ад 5 чэрвеня 1947 г. было аднагалосна прынята рашэнне аб вылучэнні прафесара С. Р. Бархударава ў правадзейныя члены Акадэміі навук Беларускай ССР за “яго цікавасць да беларускай культуры і дапамогу ў падрыхтоўцы беларускіх нацыянальных кадраў па лінгвістыцы” [1, арк. 8]. На жаль, ініцыятыва супрацоўнікаў інстытута не знайшла водгукаў у вышэйстаячых інстанцыях і скончылася безвынікова.

Сярод іншых пасляваенных дзеячаў адукацыі варта ўзгадаць **Гургена Амірханавіча Марціросава** (1912–1995) Закінуты ваенным ліхалеццем у Беларусь, ён з 1945 г. пачаў працаваць у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце старшым выкладчыкам кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі. Падчас навучання ў аспірантуры Г. А. Марціросаў у 1951 г. быў часова прызначаны старшым выкладчыкам кафедры логікі і гісторыі філасофіі БДУ [2, арк. 10]. Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі па філасофіі ў 1954 г., Гурген Амірханавіч з 1955 па 1977 гг. працаваў загадчыкам кафедры філасофіі і палітэканоміі ГрДУ [8]. Паралельна з 1961 па 1967 гг. знаходзіўся на пасадзе дэкана гісторыка-філалагічнага факультэта. Трэба падкрэсліць, што Гурген Амірханавіч стаяў ля вытокаў філасоўскай думкі ў Гродненскім універсітэце.

З 1945 г. і да апошніх дзён жыцця працаваў і жыў у Беларусі **Сяргей Сяргеевіч Атаеў** (1916–2006). Па прыбыцці ў Мінск яго прызначаюць галоўным інжынерам будаўнічага ўпраўлення трэсту «Белтрактарбуд», які адказваў за ўзвядзенне Мінскага трактарнага завода. На гэтай пасадзе ён прапрацаваў да 1950 г. [14, с. 48]. Паколькі ў рэспубліцы адчуваўся дэфіцыт кваліфікаваных спецыялістаў у галіне будаўніцтва на фоне імклівага росту запатрабаванняў у жыллі і новых вытворчасцей, Сяргея Сяргеевіча запрасілі ў 1947 г. працаваць дацэнтам на кафедру тэхналогій будаўнічай вытворчасці Беларускага палітэхнічнага інстытута ім. І. В. Сталіна [5, арк. 19 адв.]. Перадаючы ўласны вопыт студэнтам, ён знаходзіў час і для напісання кандыдацкай дысертацыі на тэму “Даследаванне эфектыўнасці механізацыі пад’ёмна-транспартных працэсаў у малапавярховым будаўніцтве Беларусі”. У 1950 г., калі ён яшчэ нават не абараніўся, ВАК СССР прысвоіў інжынеру С. С. Атаеву званне дацэнта кафедры будаўнічай вытворчасці. Па выніках паспяховай абароны дысертацыі, яму ў 1953 г. была прысвоена вучоная ступень “кандыдат тэхнічных навук”. Пакінуўшы на час палітэхнічны інстытут, ён перайшоў на працу ў будтрэст № 1 г. Мінска на пасаду галоўнага інжынера, дзе ажыццяўляў тэхнічнае і арганізацыйнае кіраўніцтва будаўніцтва сотняў аб’ектаў у беларускай сталіцы (тэлецэнтр, ЦЭЦ-3, ЦЭЦ-2, Беларускі дзяржаўны мастацкі музей). Пры гэтым ён паспяваў кіраваць ў Акадэміі навук БССР серыяй

даследаванняў у галіне павышэння эфектыўнасці механізацыі работ у жыллёвым будаўніцтве. Са стварэннем Інстытута будаўніцтва і архітэктуры Дзяржбуда БССР ў 1957 г. С. С. Атаеў стаў яго першым дырэктарам і ўзначальваў яго да 1971 г. У гэты перыяд ён паспеў абараніць доктарскую дысертацыю (1962). З 1971 па 1979 гг. Сяргей Сяргеевіч – загадчык кафедры “Тэхналогія будаўнічай вытворчасці” Беларускага палітэхнічнага інстытута (БПІ). Пад яго рэдакцыяй і пры аўтарскім удзеле была выдадзена серыя падручнікаў па курсе “Тэхналогія будаўнічай вытворчасці”, якія вытрымалі некалькі выданняў, у тым ліку і на англійскай мове. Свае лекцыі ён чытаў не толькі ў сценах БПІ, але і ў Штутгарцкім універсітэце, у Вышэйшай эканамічнай школе В’етнама.

У 1979 г. па ўзгадненні з Дзяржбудам СССР і Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхніцы СССР у БССР быў створаны новы Навукова-даследчы інстытут арганізацыі і кіравання будаўніцтвам, узначаліць які даручана было С. С. Атаеву. За гады яго кіраўніцтва (1979–1987) інстытут заняў лідзіруючыя пазіцыі, як у СССР, так і ў краінах Савета эканамічнай узаемадапамогі. У 1988 г. Сяргей Сяргеевіч зноў вярнуўся ў родны БПІ, дзе працаваў на кафедры “Будаўнічая вытворчасць” на пасадзе прафесара на працягу пяці гадоў. З 1993 г. і да канца жыцця ён працаваў галоўным спецыялістам і галоўным навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнага прадпрыемства “Інстытут жылля – НДПТІБ” (навукова-даследчага і праектна-тэхнічнага інстытута будаўніцтва), якому ў 2007 г. было прысвоена імя Атаева. Паралельна ў 1993 г. ён заснаваў і ўзначаліў адзін з першых прыватных ВНУ ў Рэспубліцы Беларусь – Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці. Гэта ўстанова паспяхова функцыянуе і цяпер. Указам ад 21 мая 1996 г. кіраўнік дзяржавы А. Г. Лукашэнка адзначыў выдатныя заслугі Сяргея Сяргеевіча медалём Францыска Скарыны. У 2000 г. Калегі з Брытанскай інжынернай акадэміі прысвоілі яму ганаровае званне «Выбітны інжынер XX стагоддзя» і ўзнагародзілі Вялікі медалём. Ён быў абраны акадэмікам Расійскай акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук і Украінскай акадэміі будаўніцтва.

Разам з Атаевым у Мінск у 1947 г. па заяўцы трэста “Белтрактарбуд” прыехала **Хачатранц Ірына Татевосаўна** (1916–1999), якая ў 1950 г. перайшла на працу ў БПІ. Дарычы яны вельмі добра пасябравалі. У 1956 г. І. Т. Хачатранц была зацвержана ў званні дацэнта [22, арк. 16]. За гады працы ў ВНУ (да 1986 г.) яна падрыхтавала больш за 5000 інжэнераў і 14 кандыдатаў навук, выдала тры манаграфіі. За шматгадовую працу ў 1974 г. ёй было ўручана ганаровае званне “Заслужаны будаўнік БССР”). Сярод іншых вядомых інжэнераў-выкладчыкаў трэба ўзгадаць таксама **Іосіфа Мікалаевіча Ахвердава** (1916–2007). Ён у 1959–1971 гг. працаваў загадчыкам кафедры будаўнічых матэрыялаў БПІ. Ужо пазней І. М. Ахвердаў (1971–1987 гг.) з’яуляўся загадчыкам кафедры тэхналогіі бетону і жалезабетону палітэхнічнага інстытута. Акрамя будаўнічай тэматыкі, яго навуковыя даследаванні былі прысвечаны праблемам фізіка-хімічнай механікі, рэалогіі бетонных сумесяў, трываласці і дефарматыўнасці бетону,

тэхналогіі вырабу бетонных і жалезабетонных вырабаў і канструкцый [12, с. 117].

Трэба падкрэсліць, што армяне актыўна ўключыліся ў навуковую працу ў БССР. У нацыянальным складзе навуковых работнікаў Беларусі яны былі прадстаўлены наступным чынам: у 1960 г. працавала 21 чалавек, з якіх 1 доктар навук, 11 кандыдатаў навук, у 1970 г. працавала 59 чалавек, з якіх 4 доктара і 24 кандыдата, у 1987 г. – 80 чалавек – 4 доктара, 27 кандыдатаў [25, с. 208]. Так, з 1954 г. у Мінску жыў і працаваў **Мірза Масэсавіч Авакаў** (1925–1987). З 1 верасня 1954 г. ён на пасадзе дацэнта перайшоў на выкладчыцкую працу на кафедру савецкага права ў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя. В. В. Куйбышава, дзе прапрацаваў з 1954–1963 гг. 17 верасня 1958 г. рашэннем ВАК СССР М. М. Авакаў быў зацверджаны ў вучоным званні дацэнта па кафедры марксізму-ленінізму (курс грамадзянскага і працоўнага права). У 1956 г. у сувязі з адсутнасцю ў БДУ спецыялістаў па міжнароднаму праву, Мірзу Масэсавіча, на ўмовах пагадзіннай аплаты, запрасілі на пасаду дацэнта кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта [3, арк. 27]. Там ён стаў першым чытаць курсы “Міжнароднае права”, “Дзяржаўнае права краін народнай дэмакратыі” і “Асновы савецкай дзяржавы і права”. М. М. Авакаў таксама чытаў курсы ў Вышэйшай школе Міністэрства аховы грамадскага парадку БССР. Акрамя напружанай педагагічнай працы, ён з’яўляўся народным засядацелем у Мінскім абласным судзе, быў членам Мінскага абкама КП(б)Б, кіраваў менскай школай лектараў-міжнароднікаў, з’яўляўся старшынёй навукова-метадычнай рады Мінскага гарадскога таварыства «Веды». З 1963 па 1965 гг. Мірза Масэсавіч знаходзіўся ў творчым адпачынку – займаўся напісаннем доктарскай дысертацыі па тэме “Праваператэмнасць дзяржаў у сучасным міжнародным праве”, тэкст якой прадставіў да абароны ў 1966 г. Паралельна гэты перыяд яго біяграфіі адзначаны актыўным удзелам у складзе дэлегацыі Беларускай ССР на міжнародных канферэнцыях ААН. У 1963 г. ён удзельнічаў у канферэнцыі па консульскіх зносінах у Вене, у 1965 г. – у 51-й канферэнцыі Асацыяцыі міжнароднага права ў Токіо, у 1966 г. – у 52-й канферэнцыі ў Хельсінкі. У 1965 г. таксама чытаў лекцыі па міжнароднаму праву ў ГДР. У 1966 г. Мірза Масэсавіч прайшоў па конкурсе на пасаду дацэнта кафедры тэорыі дзяржавы і права БДУ. 27 верасня 1967 г. ва ўніверсітэце ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю, па выніках якой 15 сакавіка 1968 г. яму была прысуджана вучоная ступень доктар юрыдычных навук. У снежні 1967 г. М. М. Авакаў быў абраны на пасаду прафесара, а 1 лістапада 1968 г. зацверджаны ў вучоным званні прафесара па кафедры тэорыі дзяржавы і права БДУ. За гады працы ў ВНУ БССР (1954–1972) ім было апублікавана 25 навуковых прац, сярод якіх можна вылучыць манаграфію «Праваператэмнасць савецкай дзяржавы» (1961), навучальны дапаможнік для курсаў удасканалення дыпламатычных работнікаў МЗС СССР «Крах каланіяльнай сістэмы і некаторыя пытанні праваператэмства» (1964), «Даведнік па працоўным заканадаўстве» (1961, 1963, 1966), манаграфію «Праваператэмнасць дзяржаў, якія ўзніклі ў

выніку сацыяльных рэвалюцый і нацыянальна-вызваленчай барацьбы» (1967).

30 лістапада 1971 г. на імя рэктара БДУ акадэміка А. М. Сеўчанкі быў накіраваны ліст ад рэктара Вышэйшай дыпламатычнай школы МЗС СССР прафесара У. І. Папова з просьбай пераводу М. М. Авакава ў Маскву на працу. 9 снежня 1971 г. прафесар Авакаў напісаў заяву аб звальненні з БДУ па ўласным жаданні. З 1972 па 1986 гг. ён працаваў на пасадзе прафесара кафедры міжнароднага права Дыпламатычнай Акадэміі МЗС СССР, а ў 1987 г. быў прызначаны прарэктарам Акадэміі.

Значную ролю ў гісторыі геагарафічнага факультэта БДУ адыграў стваральнік і загадчык кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін (пазней фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў) прафесар, доктар геаграфічных навук **Віктар Рыгоравіч Заўрыеў** (1908–1976) [4]. На гэтай пасадзе ён працаваў з 1961 па 1975 гг. В. Р. Заўрыеў чытаў курсы па фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў, праблемах фізічнай геаграфіі, фізіка-геаграфічнаму раянаванню, выдаў дапаможнік па лабараторных і практычных занятках па фізічнай геаграфіі мацерыкоў (1963, 1971). Яго навуковыя інтарэсы былі звязаны з праблемамі Палесся, дынамікай палескіх азёр. Пад кіраўніцтвам В. Р. Заўрыева было абаронена 3 кандыдацкіх дысертацыі, а за час яго кіравання кафедрай – 2 доктарскіх і 5 кандыдацкіх дысертацый. За плённую шматгадовую навукова-педагагічную і грамадскую працу, прапаганду навуковых ведаў сярод насельніцтва В. Р. Заўрыеў быў узнагароджаны медалём “За працоўную доблесць”, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, граматамі Усесаюзнага таварыства “Веды” і інш. Віктар Рыгоравіч ўвайшоў у гісторыю геаграфічнай навукі як высокакваліфікаваны вучоны-географ, таленавіты арганізатар і педагог. Яго аўтарытэт і сёння застаецца высокім сярод вучняў і паслядоўнікаў [10, с. 114].

Не менш вядомым спецыялістам у галіне геаграфіі з’яўляўся **Акмір Ягішавіч Агаханянц** (1927–2002). На працягу 30 год (з 1973 г.) ён працаваў на пасадзе прафесара ў Беларускім педагагічным інстытуце, быў загадчыкам кафедры геабатанікі, пастаянным кіраўнікам студэнцкай практыкі на Каўказе, у Карпатах і Паміры. На мінскіх гарадскіх курсах удасканалення настаўнікаў Акмір Ягішавіч таксама вёў курс геаграфіі і геабатанікі для настаўнікаў сярэдніх школ.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі на пасадзе дэкана факультэта інфармацыйных тэхналогій і кірвання з 1999 па 2002 г. працаваў доктар тэхнічных навук, прафесар **Уладзімір Анатольевіч Кешыш’ян** (1942–2002). [24]. У інстытуце ён пачаў працаваць з 1970 г. і прайшоў усе ступені прафесійнага росту: асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры тэарытычных асноў электратэхнікі. На працягу гэтага часу У. А. Кешыш’ян паспяхова кіраваў падрыхтоўкай навукова-педагагічных кадраў, аспірантаў і суіскальнікаў [6, с. 286].

З 1993 г. загадчыкам кафедры фізікі Інстытута ўдасканалення настаўнікаў г. Брэста працуе беларускі вучоны ў галіне матэматычнай фізікі, доктар фізіка-матэматычных навук **Роланд Сяробавіч Варданян** (1941 г. нарадж), У 2000–2005 гг. ён знаходзіўся на пасадзе прафесара кафедры тэарэтычнай фізікі і астраноміі Брэсцкага дзяржаўнага

ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Роланд Сяробовіч аўтар шэрагу навуковых прац па нелінейным задачам і тэорыі пераносу выпраменьвання, дыфракцыі рэнтгенаўскіх прамянёў. Арамя навуковай дзейнасці ён прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы навуковых і педагагічных кадраў.

Нельга абыйсці таксама і ўклад прадстаўнікоў армянскага народа ў падрыхтоўцы медыцынскіх навуковых і ўрачэбных кадраў. Так, з 1950 г. загадчыкам кафедры нервовых хвароб Віцебскага медыцынскага інстытута з’яўляўся доктар медыцынскіх навук, прафесар **Арташэс Айрапетавіч Кеварк’ян** (1987–1955), які ў 1955 г. быў прызначаны намеснікам дырэктара інстытута па навуковай і вучэбнай рабоце, але паспеў парпацаваць на гэтай пасадзе нядоўгі час з прычыны смерці [7, с. 40]. З 1959 па 1981 гг. загадчыкам кафедры нармальнай анатоміі Гродненскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута з’яўляўся доктар медыцынскіх навук, прафесар **Армэн Мікалаевіч Габузаў** (1906–1999) [9, с. 53] У сувязі з 10-гадовым юбілеем інстытута ў 1968 г. за актыўны ўдзел у падрыхтоўцы навуковых і ўрачэбных кадраў міністрам аховы здароўя яму была аб’яўлена падзяка [17, арк. 19] Пад кіраўніцтвам А. М. Габузава было падрыхтавана 4 кандыдата медыцынскіх навук. Сярод другіх медыкаў і выкладчыкаў ВНУ трэба ўзгадаць **Леаніда Ібрагімавіча Друяна** (1944 г. нарадж.), які з адкрыццём ў Гомелі медыцынскага інстытута актыўна ўключыўся ў стварэнне на базе Гомельскага абласнога клінічнага шпіталя івалідаў Вялікай Айчыннай вайны кафедры прапедэўтыкі ўнутранных хвароб. На гэтай кафедры ён чытаў курс лекцый і праводзіў практычныя заняткі. У 1992 г. выдавецтва “Вышэйшая школа” выпусціла яго кнігу “Кароткі тэрміналагічны слоўнік для медыцынскіх сёстраў”, дзе медыцынскія тэрміны ўпершыню былі выкладзены на беларускай мове [15, с. 59]. У 2001 г. згодна з указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Л. І. Друяну было прысвоена ганаровае званне “Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь”. Дэрэчы яго бацька – Ібрагім Леанідавіч – ў 1964 г. атрымаў ганаровае званне “Заслужаны ўрач БССР”.

На падставе вышэйузгаданых прадстаўнікоў армянскага народа ў Беларусі, хоць гэты спіс можна працягнуць і далей, але і так добра бачна, што амаль кожны з накірункаў дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў можа быць праілюстраваны на канкрэтных прыкладах. Абапіраючыся на іх можна падкрэсліць, што прысутнасць на тэрыторыі Беларусі розных этнічных груп спрыяе ўзбагачэнню навукі і культуры, а збалансаваная дзяржаўная палітыка па захаванню і забеспячэнню праў асоб, якія прыналежаць да нацыянальных меншасцяў, садзейнічае патэнцыялу для раскрыцця ведаў і ўменняў на карысць іх новай Радзімы.

## Бібліяграфічны спіс


1. Архіў БДПУ імя М. Танка. – Ф. 746. – Воп. 1. – Спр. 19.
2. Архіў БДУ. – Ф. 205. – Воп. 1 пс. – Спр. 200.
3. Архіў БДУ. – Ф. 205. – Воп. 10. – Спр. 160.
4. Архіў БДУ. – Ф. 205. – Воп. 10. – Спр. 215.
5. Архіў БНТУ. – Ф. 210. – Воп. 59. – Спр. 36.

6. Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники: история в биографиях ректоров, ученых удостоенных почетных званий, лауреатов премий, профессоров, докторов наук: 40 лет (1964–2004) / М. П. Батура, В.М. Ильин, Е.К. Новик, А.И. Валаханович. – Минск: Вышэйшая школа, 2004. – 421 с.
7. Витебский государственный медицинский университет: 80 лет, 1934–2004 / Под ред. А. Н. Косинца. – Витебск: ВГМУ, 2004. – 216 с.
8. Габрусевич, С. А. «Учитель живет в учениках» (к 100-летию со дня рождения Г.А. Мартиросова) // Гродзенскі ўніверсітэт. – 2012. – 22 лютага.
9. Гарелик, П. В. 50 лет Гродненскому государственному медицинскому университету: события и биографии. – Гродно: ГрГМУ, 2008. – 544 с.
10. Жмойдяк, Р. А., Еловичева, Я. К., Лопух, П. С. Виктор Григорьевич Завриев – ученый и педагог (к 100-летию со дня рождения) // Вестник БГУ. Сер. Химия, биология, география. – 2008. – № 1. – С. 113–114.
11. Звезда. – 1919. – 1 марта.
12. Иосиф Николаевич Ахвердов (К 80-летию со дня рождения) // Известия НАН Беларуси. Сер. физ.-техн. наук. – 1996. – № 4. – С. 117–118.
13. Итоги Всесоюзной переписи населения 1959 года. Белорусская ССР / Центр. стат. упр. при Совете Министров СССР. – М.: Госиздат, 1963. – 146 с.
14. К столетию Сергея Сергеевича Атаева // Архитектура и строительство. – 2016. – № 3. – С. 48.
15. Леонид Ибрагимович Друян (к 60-летию со дня рождения) // Здравоохранение. – 2004. – № 8. – С. 59.
16. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей –НАРБ). – Ф. 4. – Воп. 1. – Спр. 131.
17. НАРБ. – Ф. 46. – Воп. 16. – Спр. 3.
18. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 4.
19. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 9.
20. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 75.
21. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 428.
22. НАРБ. – Ф. 210. – Воп. 4. – Спр. 787.
23. НАРБ. – Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 1119.
24. НАРБ. – Ф. 270. – Воп. 8. – Спр. 627.
25. Пушкін, І. А. Удзел нацыянальных мешасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). – Мінск: БДУ, 2010. – 318 с.

**Мещанова Мария Валентиновна, Салей Елена Анатольевна**
*Белорусский госудасртвенный университет (Минск, Беларусь)*

## НАУЧНО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ШКОЛА ГРАЖДАНСКОГО ПРАВА БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА: ФОРМИРОВАНИЕ И РАЗВИТИЕ

В юридической литературе вопросы понятия и видов научных школ, как правило, не поднимаются и не исследуются. Это прерогатива преимущественно науки философии, социологии, истории, педагогики. При этом в работах по юриспруденции нередко содержатся ссылки на ту или иную научную школу права, исследуется научное наследие ее основателей, демонстрируется преемственность творческого наследия учителей в работах учеников, освещаются направления и прогнозные перспективы развития научной школы.

Сама по себе констатация наличия сформировавшейся научной школы может и не иметь официального документального подтверждения (например, в форме разработки Положения о научных школах, на основе которого в установленном порядке должна быть проведена верификация